направленный. Развитие искусства в переходные периоды, подобные современному, отмечается широтой и разнообразием. Творческие находки художников становятся достоянием многих, поднимается общий уровень искусства, изменяется художественная среда в целом. Если посмотреть на достижения с этой позиции, то рубеж XX-XXI веков в отечественном искусстве обретет свою ценность, очень актуальную для современных и будущих процессов.

## СУЧАСНАЯ АРХІТЭКТУРА ЯК СРОДАК САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

***Захарына Ю. Ю.***
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

*This article is devotes to define of place of contemporary architecture in the social and cultural globalization. The variation of the communication quality of contemporary architecture to be showed.*

Сучасная архітэктура разнастайная па сваіх формах, прасторавых, канструкцыйных, мастацка-вобразных рашэннях. Варыятыўнасць архітэктурных кампазіцый, стаўшая вынікам захавання нацыянальных традыцый і эвалюцыі архітэктурнай думкі, навукова-тэхнічнага прагрэсу, вызначыла зменлівы, адкрыты для развіцця характар асяроддзя жыцця чалавека. У сучасную культурную прастору аказаліся ўцягнутымі не толькі традыцыйныя элементы нацыянальных культур, што вызначылі рэгіянальныя адрозненні, але і здабыткі постіндустрыяльнай эпохі. Пад уплывам глабалізацыі нацыянальны крытэрый прыгажосці паступова пачаў страчваць сваю моц; межы нацыянальнай і сусветнай культуры сталі размытымі. Як адзначае архітэктар Р. Меер, «мы ўсе зараз жывем ва ўмовах глабальнай сусветнай культуры. Рэгіянальныя культурныя адрозненні краін ужо не адыгрываюць такой вялікай ролі, як у мінулым» [1, с. 114].

Сціранне дакладных нацыянальных граней мастацтва адбывалася пад уплывам розных фактараў і атрымала як станоўчыя, так і негатыўныя вынікі. Навучанне мастакоў, дойлідаў за межамі краіны, іх удзел у міжнародных конкурсах, семінарах, канферэнцыях спрыялі не толькі абмену вопытам, але і выпрацоўцы агульнай мовы сучаснага мастацтва, і ўцягненню ў сусветную інфармацыйную сістэму адзіных падыходаў да творчага выражэння адносінаў да глабальных праблем. Яскравыя творы мастацтва набылі славу і сталі ўзорамі прыгажосці, прывабнымі для капіравання, пераймання. Так паступова ўтварыўся «слоўнік» мастацкіх вобразаў як часавых крытэрыяў прыгажосці, што не маюць рэгіянальных межаў. Пры гэтым асіміляцыя сусветных дасягненняў мастацтва пазначыла не толькі агульныя тэндэнцыі ў яго развіцці, але і спрыяла выпрацоўцы стэрэатыпнасці мыслення ў іх мастацкім выражэнні.

Камунікатыўны характар сучаснай архітэктуры з’явіўся адной з форм праяўлення сацыякультурнай глабалізацыі. Пад сацыякультурнай глабалізацыяй разумеецца фарміраванне міжкультурных камунікацый. Кансалідацыі міжкультурных сувязяў у многім спрыяла арганізацыя міжнародных творчых конкурсаў, біенале як спосаба прыцягнення да творчасці спецыялістаў з усяго свету. Конкурсная аснова творчасці дазваляе не толькі выбраць лепшы праект, але і пазнаёміцца з работай дойлідаў, і вынікамі сусветнай архітэктурна-праектыровачнай дзейнасці.

Рэалізацыі функцыянальных і камунікатыўных задач сучаснай архітэктуры спрыяла і актывізацыя супрацоўніцтва паміж дойлідамі, інжынерамі і заказчыкамі. Часта вобраз будынкаў, адлюстроўваючы фактар сваёй унікальнасці, асацыіруецца з імёнамі іх архітэктараў, прываблівыючы новых заказчыкаў. Многія заказчыкі звяртаюцца да сусветных лідэраў архітэктурна-праектыровачнай дзейнасці, замаўляюць праекты з разлікам на пэўны аўтарскі стыль, творчы почырк. Яны імкнуцца да таго, каб мастацкі вобраз архітэктурнага аб’екта лёгка чытаўся не толькі ў асяроддзі дойлідаў,

але і пазнаваўся масамі людзей. Кожны стыль нясе ў сабе пэўную ідэйную накіраванасць: паказаць канструкцыйна-тэхнічныя магчымасці ў архітэктуры, сцвердзіць ідэю самадастатковасці пабудовы, выявіць сімволіку эпохі, краіны, горада і г. д. Імкненне заказчыка адлюстраваць падобныя ідэі ў сваёй лакальнай культурнай прасторы, зрабіць архітэктурныя рашэнні сімваламі сваёй дзяржавы прыводзяць да рэтрансляцыі сусветных мастацкіх ідэй, транспаніравання культурных каштоўнасцяў аднаго рэгіёна ў іншы. У выніку нярэдка праекты славутых архітэктараў рэалізуюцца ў розных краінах свету, уносячы ў мясцовую культуру новы вобразны пачатак. Але ўплыў глабалізацыі на архітэктурна-праектыровачную дзейнасць паступова прывёў да з'яўлення мастацка-вобразных штампаў.

У сваю чаргу глабалізацыя спрыяла і вызначэнню прыярытэтных напрамкаў архітэктурна-будаўнічай практыкі ў сусветным маштабе. Архітэктурна-будаўнічая дзейнасць заўсёды адказвала запытам грамадства свайго часу; на сучасным этапе запатрабаванымі яе напрамкамі сталі: арганізацыя культурна-дасугавай і інфармацыйнай прасторы, узвядзенне спартыўных комплексаў, развіццё інфраструктуры і будаўніцтва транспартных аб'ектаў.

У фарміраванні сучаснай культурнай прасторы асобнае месца занялі музеі. Сучасны музей не толькі працягвае задавальняць патрэбы эліты, але і становіцца крыніцай пазнання шырокай аўдыторыі. У духоўным жыцці сучаснага грамадства музеі займаюць месца, што раней адводзілася саборам. Яны з'яўляюцца часткай гарадской прасторы (цэнтр Жоржа Пампіду ў Парыжы, Францыя, арх. Р. Піяна, Р. Роджэрс, 1971–1976 гг.), служаць гістарычным сведчаннем часу (музей гісторыі Палмач у Тэль-Авіве, Ізраіль, арх. З. Хекер, 1992–1998 гг.). У рэалізацыі культурна-дасугавай функцыі музея значную ролю адыгрывае яго архітэктура: яна павінна адлюстроўваць спецыфіку музея праз мастацка-вобразнае рашэнне, прываблiваць публіку. У сувязі з гэтым многія музеі мадэрнізуюцца (прыбудова да Нацыянальнага мастацкага музея ў Мінску, Беларусь, арх. В. Бялянкін, арх. інтэр'ераў А. Ярмолін, 1990–2000-я гг.), пашыраецца іх профільная накіраванасць; іх калекцыі ўключаюць ужо не толькі помнікі гісторыі, культуры, мастацтва і аб'екты прыроды, але і сінтэзуюць дасягненні розных сфер дзейнасці чалавека, як, напрыклад, навукі і мастацтва (цэнтр мастацтваў і навукі ў Валенсіі, Іспанія, арх. С. Калатрава, 1991–2006 гг.), адкрываюць новыя напрамкі музеязнаўства (Вулканічны музей у Сант-Ор ле Рош, горы Авернь, Францыя, арх. Г. Холейн, 2002 г.; віртуальны музей Гегенхейма ў Нью-Ёрку, Нью-Ёрк, ЗША, арх. група «Asymptote», 1999–2002 гг.).

На мяжы II–III тысячагоддзяў перагляду падверглася арганізацыя прасторы цэнтраў культуры, бібліятэк. Сучасныя цэнтры культуры як адносна новая разнавіднасць архітэктуры ўяўляюць полівалентную прастору, якая адпавядае патрэбам розных па інтарэсах рэцыпіентаў. Яны, падобна музеям, ствараюцца ў культурна-асветных мэтах і рэпрэзентуюць гістарычную спадчыну краіны або культурнага рэгіёна (цэнтр культуры арабскага свету ў Парыжы, Францыя, арх. Ж. Нувэль, 1981–1987 гг.; цэнтр культуры ў Нумеа, Нью Каледонія, арх. Р. Піана, 1992–1998 гг.). Архітэктура цэнтраў культуры, як і музеяў, бібліятэк і іншых будынкаў і збудаванняў, павінна праз мастацкія вобразы выражаць іх сутнасць, ідэйную накіраванасць. З гэтай мэтай мастацкія вобразы архітэктуры падвяргаюцца сімвалізацыі, закліканай паведамляць кадзіраваную інфармацыю, даступную для ўспрымання масамі. Пры розных мастацка-вобразных рашэннях, розных узроўнях сімвалізацыі – у якасці інтэрпрэтацыі гістарычных матываў, уласцівых архітэктуры такога роду ўстаноў (будынак бібліятэкі Александрыны ў Александрыі, Егіпет, арх. група «Snohetta», 1995–2001 гг.) [2, с. 738–743] або адсылу да першавобраза, што на асацыятыўным узроўні стварае каштоўнасныя арыенціры (будынак Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску, Беларусь, арх. В.Крамарэнка, М.Вінаградаў, 2006 г.) – сучасная архітэктура музеяў, культурных цэнтраў, бібліятэк выклікае эмацыянальны водгалас, які спрыяе матывацыі да наведвання. Паколькі цэнтры культуры, музеі, бібліятэкі маюць у аснове падобныя функцыі і выступаюць элементамі інфармацыйнай прасторавай сістэмы, сімволіка іх мастацкіх вобразаў, выражаная ў архітэктуры, вызначаецца агульнай задачай – пашыраць веды навед-

вальнікаў аб гісторыі культуры і сучаснасці, уключаць іх у сусветную культурную прастору.

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў у культурным жыцці грамадства значна ўзрасло значэнне спорту, што выклікала неабходнасць змен архітэктуры спартыўных збудаванняў, якія маглі б прымаць шырокую аўдыторыю. Праектаванне стадыёнаў і спартыўных комплексаў стала накіравана на рашэнне пытанняў перакрыцця і асвятлення грандыёзнай прасторы для велізарнай колькасці наведвальнікаў і ўдзельнікаў. Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій, а таксама сумесная работа архітэктараў і інжынераў далі вынік стварэння ўтылітарных і ў той жа час арыгінальных па вобразнай задуме збудаванняў, асобныя з якіх былі ўзведзены ў ранг архітэктурных шэдэўраў новага часу. Многія сучасныя спартыўныя збудаванні сталі праслаўленымі аб'ектамі і трапілі ў сусветную інфармацыйную прастору як узоры дасканаласці і прыгажосці (стадыён «Юка» ў Адатэ, в. Хансю, Японія, арх. Т. Іто, 1995–1997 гг.; гарадскі стадыён у Бразе, горы Кастра, Партугалія, арх. Э. С. дэ Мура, 2004 г.; Пекінскі нацыянальны стадыён «Птушынае гняздо», Кітай, арх. бюро «Герцаг і дэ Мярон», 2003–2008 гг.).

Актыўнае развіццё турызму, пашырэнне эканамічных сувязяў пацягнула за сабою неабходнасць стварэння новых камунікацый, што адказваюць сучаснаму стылю жыцця. Інтэнсіўны рух транспарту і адкрыццё новых авіякампаній патрабавалі пашырэння існуючых аэрапортаў і стварэння новых (мадэрнізацыя аэрапорта Шарля дэ Голя ў Парыжы, Францыя, арх. П. Андрэ, 1990–1998 гг.). Рэльсавы транспарт стаў больш эфектыўным за кошт увядзення ў эксплуатацыю новых хуткасных ліній (тэрмінал міжнароднага пункта Ватэрлоо ў Лондане, Англія, арх. Н. Грымшоў, 1993 г.). Пашырэнне гарадскіх межаў стала прычынай павелічэння чыгуначных станцый і ліній метрапалітэна (Гамбургскі вакзал у Берліне, Германія, арх. Дж. П. Кляйхуэс, 1992–1996 гг.; вакзал у Кіёта, Японія, арх. Х. Хара, 1991–1997 гг.). Рэнавацыя і пашырэнне сеткі дарог прывялі да стварэння новых інфраструктур і дарожных сувязяў (мост Еўропы ў Арлеане, Францыя, арх. С. Калатрава, 1996–2000 гг.) [3, с. 358–371]. Мадэрнізацыя і будаўніцтва новых транспартных камунікацый дазволіла мабілізаваць сацыякультурныя сувязі паміж населенымі пунктамі, краінамі, кантынентамі. Аднак у адрозненне ад папярэдніх эпох, архітэктура якіх дакладна адпавядала функцыянальнаму прызначэнню аб'ектаў, сучасныя дойліды імкнуцца пры захаванні галоўнай утылітарнай накіраванасці ствараць шматфункцыянальныя комлексы, што адначасова служаць сродкам камунікацыі і камфортным месцам адпачынку («Mur Island Project» у Грацы, Аўстрыя, арх. В. Акончы, 2003 г.).

Глабалізацыя сучаснай культуры стала вызначальным фактарам развіцця і ўмацавання міжкультурных камунікацый. Фарміраванне адзінай культурнай прасторы спрыяла ўцягненню рэгіянальных мастацкіх каштоўнасцяў у сусветны кантэкст. Адным са сродкаў сацыякультурнай глабалізацыі з'явілася архітэктура. Ва ўмовах трансфармацыі каштоўнасных арыенціраў, што пацягнула за сабою мастацка-вобразныя мадуляцыі, вызначэнне перспектыўных напрамкаў архітэктурна-будаўнічай практыкі (будаўніцтва цэнтраў культуры, бібліятэк, музеяў, спартыўных комплексаў, аб'ектаў камунікацыі) стала сведчаннем імкнення захаваць культурную спадчыну, развіцця наватарскіх канструкцыйна-тэхнічных і вобразных ідэй. Аднак уцягненне ў сусветную культурную прастору сучасных арыгінальных архітэктурных вобразаў, што сталі ўзорамі для пераймання, спрыяла распаўсюджанню мастацка-вобразных клішэ і ўзмацаванню пазіцый масавай культуры.

**Літаратура**


1. Новейшая архитектура / [гл. ред. Ф. Ходидьо]; пер. с англ. А.М. Ведюшкина. – М.: АСТ: Астрель, 2008. – 192 с.
2. Jodidio, P. 100 contemporary architects / P. Jodidio. – Cologne: Taschen, 2008. – 848 p.
3. Prina, F., Demartini E. 1000 Years of World Architecture / F. Prina, E. Demartini. – London: Thames & Hudson Ltd., 2006; reprinted 2007. – 429 p.